

«РЫСЯНЯТЫ» КОЛЕРУ ХАКІ 5

СУСВЕТНЫ ПАРАЛІМПІЙСКІ РУХ МНОГАЕ СТРАЦІЎ 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

31 СТУДЗЕНЯ 2023 г. АЎТОРАК № 19 (29899)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей КАЛЕЧЫЦ, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка:**

*«На сёння мы бачым, што кароткатэрміновы эфект ад увядзення санкцый вычарпаны і пік высокай інфляцыі пройдзены. Назіраецца ўстойлівае зніжэнне індэкса спажывецкіх цэн і трэндавай інфляцыі. Паводле нашых ацэнак, аднаназначных велічынь гадавая інфляцыя дасягне ўжо да канца першага квартала 2023 года. Сёлета ўрадам і Нацыянальным банкам пастаўлена задача па яе запавольненні да ўзроўню 7-8 працэнтаў. Сумеснымі намаганнямі важна максімальна абмежаваць уплыў праінфляцыйных фактараў. Тым больш што пры адсутнасці новых шокаў інфляцыйнае асяроддзе стане больш спрыяльным. У многім зніжэнню інтэнсіўнасці гэтых працэсаў будзе садзейнічаць работа на аптымізацыі затрат і паскораным імпартазамяшчэнні, якая праводзіцца прадпрыемствамі. Таму спрыяе нармалізацыя інфляцыйных працэсаў у Расіі, прымальны ўзровень цэн на імпартуемыя энерганосьбіты, а таксама стабілізацыя кошту сыравінных тавараў на сусветных рынках».*

## КОРАТКА

- **Стартаваў прыём заявак на конкурс «Інтэрнэт-прэмія ТІБА».**
- Батанічны сад запрашае на інтэрактыўны практыкум «Расліны для хатняй утульнасці». Ён пройдзе 3, 4 і 5 лютага а 14-й гадзіне.

ISSN 1990 — 763X

23019>

9 771990 763008

# Кампетэнцыі і тэхналогіі



Фота БелТА.

Цэнтр кампетэнцый сучасных тэхналогій на базе Гомельскага аўтамеханічнага каледжа аснасцілі найноўшым абсталяваннем. Усяго па машынабудаўнічым профілі ў краіне працуюць тры такія цэнтры: у Мінску, Оршы і Гомелі. Профільны цэнтр кампетэнцый у Гомелі створаны ў рамках дзяржпраграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка». Гомельскі дзяржаўны аўтамеханічны каледж стаў асновай для яго рэалізацыі. Для цэнтра было пастаўлена абсталяванне апошняга пакалення. Яго выкарыстанне дазваляе вучням на належным узроўні ўдзельнічаць у конкурсе прафесійнага майстэрства па стандартах WorldSkills па кампетэнцыі «Такарныя работы на станках з праграмным кіраваннем», «Фрэзерныя работы на станках з праграмным кіраваннем».

**На здымку:** навучэнец каледжа Андрэй СУВОРАЎ на новым абсталяванні асвойвае прынцып работы разрыўнога стэнда.

## Актуальнае інтэрв'ю

**Аляксей БЯГУН:**

# «ГРАМАДЗЯНСТВА ТРЭБА ЗАСЛУЖЫЦЬ»

### Хто мае права беларусам звацца і якія дзеянні прыводзяць да страты грамадзянства?



**Ці кожны ахвотны можа атрымаць беларускі пашпарт, што ўяўляе сабой працэдура набыцця грамадзянства і пры якіх умовах можна яго страціць, карэспандэнту «Звязды» расказаў начальнік Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў палкоўнік міліцыі Аляксей БЯГУН. Кіраўнік падраздзялення таксама падзяліўся, як супрацоўнікі органаў унутраных спраў дапамагаюць перасяленцам з Украіны, ідучь у нагу з высокімі тэхналогіямі і трымаюць пад кантролем незаконную міграцыю.**

СТАР. 4

## Камунальныя стасункі

# Формула энергапаратунку жылля

### Капрамонт + цепламадэрнізацыя = амаль новы будынак



Фота Ірыны СІДАРОК.

**Сёлета камунальнікі плануюць капітальна адрамантаваць у Беларусі 1108 дамоў, або 3,7 млн м$^2$, з якіх 1,1 мільёна «квадратаў» — у сталіцы. Найбліжэйшыя ў капрамонтнай чарзе зараз будынкі, узведзеныя ў канцы 60-х — 70-я гады мінулага стагоддзя. 27 шматкватэрных дамоў у краіне са згоды і з фінансавым удзелам жыхароў атрымалі не толькі капрамонт, але і цепламадэрнізацыю. Пра некаторыя асаблівасці і праблемы капрамонту расказалі спецыялісты.**

СТАР. 6